# БУДЗЬ З НАМІ Ў РОДНЫМ КРАІ



Выпуск № 2

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў*







## *Чытайце ў гэтым нумары:*

- **ВЫНІКІ І ЧВЭРЦІ**
- **НАШЫ ЭКСКУРСІІ**
- **ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ**
- **НАШЫ ДАСЯГНЕННІ**
- **АКЦЫІ**
- **ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ**

## ВЫНІКІ І ЧВЭРЦІ

Па выніках І чвэрці якасць ведаў па школе склала 74%, а сярэдні бал 7,25. На высокім узроўні якасць ведаў па выніках чвэрці ў 3 класе (92,86%), у 9 класе (88,89%), у 11 класе (85,71%,). На дастатковым – у 5 класе (83,33%). На дапушчальным – у 4 класе (78,95%), у 8 класе (61,54%), у 7 класе (56,25%). На нізкім – у 6 класе (50%)

Па выніках І чвэрці ў нашай установе адукацыі 2 вучні, якія закончылі І чвэрць на 9-10.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Крывеня Мілана, 3 клас** |  | **Пішчык Караліна, 11 клас** |  |

************************************************************



З 27.10.2015г. па 29.10.2015г. у школе праходзіў І этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах: фізіка, матэматыка, беларуская мова і літаратура, грамадазнаўства, працоўнае навучанне, інфарматыка. У І этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах прынялі ўдзел 17 вучняў 8, 9 і 11 класаў.

****************************************

21-22 лістапада вучні Мінойтаўскай СШ прымуць удзел у ІІ этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах"Беларуская мова і літаратура" (Гур'ян Анастасія, Жашкевіч Анастасія, Пішчык Караліна) і "Фізіка" (Лукашэвіч Ян).




**Жадаем поспехаў!**

# НАШЫ ЭКСКУРСІІ

*З пачатку навучальнага года вучні нашай школы разам з настаўнікамі вывучалі родны край падчас экскурсій. З верасня па лістапад для вучняў школы былі арганізаваны разнастайныя экскурсіі. Падчас экскурсій вучні наведалі музей Адама Міцкевіча і замкавую гару ў Навагрудку, шклозавод у Бярозаўцы, царкву ў в. Ганчары, мемарыяльны комплекс "Хатынь", курган Славы і заапарк у Мінску, замак у г. Лідзе, гісторыка-краязнаўчы музей, цэнтр рамёстваў*














# ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

## Прадметны тыдзень пачатковых класаў

З 01.11.2015г. па 06.11.2015г. праходзіў прадметны тыдзень пачатковых класаў. Для вучняў пачатковых класаў былі праведзены разнастайныя мерапрыемствы розных накірункаў па вучэбных прадметах.








## Абарона калажаў

У рамках акцыі "Місія – жыць" адбылася абарона калажаў **"Шкодным залежнасцям – не".** Вучні школы творча падышлі як да стварэння калажу, так і да яго абароны.













# НАШЫ ДАСЯГНЕННІ




**Мінойтаўская СШ** у раённых спаборніцтвах па летняму шматбор'і "Здароўе" сярод сельскіх устаноў адукацыі.

****************************************




**Мусатава Надзея** ў раённай спартакіядзе школьнікаў па легкай атлетыцы ў штурханні ядра.

**Барташэвіч Данііл** у раённым этапе абласнога конкурсу даследчых работ і творчых праектаў малодшых школьнікаў "Я пазнаю свет" у секцыі "Здаровы лад жыцця"

**Стацэвіч Лізавета** ў раённым этапе абласнога конкурсу творчых работ "Мае землякі – мой гонар" у намінацыі "Гонар і слава маёй бацькаўшчыны"

**Скерсь Святлана** ў раённым конкурсе ідэй "Здаровая школа" у намінацыі "Сімвалы здаровага ладу жыцця школы"

****************************************




**Яварэц Караліна** ў раённай спартакіядзе школьнікаў па легкай атлетыцы ў штурханні ядра.

**Рудзевіч Вольга** ў бегу на 1000 метраў у адкрытым рэспубліканскім турніры сярод юнакоў і дзяўчат 2000 г.н. і маладзей на прызы ветэранаў спорта.

**Мусатава Надзея** ў раённай спартакіядзе школьнікаў па легкай атлетыцы ў прыжках у даўжыню.

**Мінойтаўская СШ** у раённай спартакіядзе па легкай атлетыцы сярод сельскіх устаноў адукацыі

**Рудзевіч Вольга** ў раённым этапе рэспубліканскага конкурсу дзяцячай творчасці "АРХ-навацыі – 2015" у намінацыі "Жывапісь. Графіка"

**ЖАДАЕМ ДАЛЕЙШЫХ ПОСПЕХАЎ!**

# АКЦЫІ

## "Здай батарэйку – дапамажы прыродзе"





З 19.10.2015г. па 27.10.2015г. у школе праходзіла экалагічная акцыя па збору батарэек "Здай батарэйку – дапамажы прыродзе". Вучні школы прынялі актыўны ўдзел у акцыі і было сабрана 2758 батарэек. Найбольш актыўны ўдзел прынялі 3, 4, 5 і 8 класы, а найбольш актыўнымі сярод вучняў сталі Крывеня Мілана (3 клас) – 278 батарэек, Рудзевіч Вольга (8 клас) – 247 батарэек, Бобрык Дзяніс (4 клас) – 156 батарэек, Баброўскі Уладзіслаў (4 клас) – 100 батарэек, Лісоўскі Уладзіслаў (2 клас) – 82 батарэйкі.



***Дзякуй за актыўны ўдзел!***

****************************************************************************

## "Цуды з бутэлек"





У прадвер'і навагодніх святаў, творчымі і ініцыятыўнымі настаўнікамі нашай школы, аб'яўляецца збор паліэтыленавых бутэлек, з якіх пазней будуць выкананы упрыгожванні для школы.

****************************************************************************

## "Першакласнік, стань прыкметным пешаходам"




06.11.2015г. у рамках адзінага дня прафілактыкі дарожна-транспартнага траўматызму была праведзена акцыя "Першакласнік, стань прыкметным пешаходам", дзе ўсім вучням першага класа былі ўручаны святловяртаючыя элементы.



# ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ

**"Утульны школьны двор"** пад такім дэвізам прайшоў працоўны дэсант 06.11.2015г. Вучні школы разам з настаўнікамі і тэхнічным персаналам добраўпарадкавалі прышкольную тэрыторыю.







## Гумарэска са школьнага жыцця



Два малыша гоняют во дворе футбольный мяч.
- Что за шум в вашей квартире? - спрашивает один.
- Это мой дедушка объясняет моему папе, как надо решать мою задачку по арифметике.

- Папа, не ходи завтра на родительское собрание в школу!
- Это почему? Там будут плохо говорить о тебе?
- Да нет, папа, о тебе!




| | | | |
|---|---|---|---|
| **Будзь з намі ў родным краі** *Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –** Мінойтаўская СШ **Галоўны рэдактар –** Хіневіч Н.М. | **Афармленне:** Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:** в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |